


# ЛІНІІ КАНФЛІКТНАСЦІ СЯРОД БЕЛАРУСКІХ ПРАДЭМАКРАТЫЧНЫХ АКТЫВІСТАЎ

(Беларусь, Польшча, Літва)

Formula of Humanity
Формула чалавечнасці

Чэрвень 2024

# КАНТЭКСТ

Беларускі пратэстны рух 2020 года аб’яднаў вельмі розныя групы, якія адрозніваліся не толькі па сацыяльна-дэмаграфічных параметрах, але і па каштоўнасных арыентацыях, па палітычных поглядах. Разнастайнасць складу тых, хто выходзіў на вуліцы ў жніўні-снежні 2020 года, неаднаразова падкрэслівалася даследнікамі як адна з асаблівасцей пратэстнага руху. Важна разумець, што працэсы салідарызацыі на той момант ахапілі мноства людзей і сацыяльных груп, якія не мелі да гэтага нічога агульнага паміж сабой, і былі аб’яднаныя толькі апрапрыяцыяй агульнай сітуацыі (назапашаная ў перыяд першай хвалі ковіда незадаволенасць, “скрадзеныя” выбары і беспрэцэдэнтнасць гвалту пры падаўленні пратэстаў).

Масавая салідарызацыя ў экзістэнцыйнай сітуацыі фармуе адмысловы тып сувязяў паміж людзьмі («гарызантальная сацыяльнасць» [1] Г. Коршунава), адмысловы тып супольнасцяў («супольнасць узрушаных» [2] Т. Шчытцовай). Але эфекты салідарызацыі ніколі не могуць быць працяглымі. З завяршэннем «катастрафічнай» сітуацыі, створаныя ёй супольнасці знікаюць або трансфармуюцца. Калі сітуацыя застаецца незавершанай, магчымыя некалькі сцэнараў, па якіх могуць трансфармавацца стасункі ў супольнасцях, што ўзніклі падчас масавай салідарызацыі:

1. «Рутынізацыя» і «нармалізацыя» сітуацыі, распад стасункаў, атамізацыя;
2. Раскол і пошук вінаватых, фармаванне варожых адно да аднаго лагераў або трайбалізацыя;
3. Захаванне салідарнасці (ужо як стану) і фармаванне новай ідэнтычнасці ўнутры супольнасці.

Удзельнікі пратэстнага руху 2020 года аб’яднаныя не толькі агульным мінулым, агульнымі (не дасягнутымі) мэтамі, але і агульнай сучаснасцю, бо разгорнутыя рэпрэсіі не дазваляюць «завяршыць» сітуацыю і «перагарнуць старонку» [3]. У ходзе падзей 2020-2023 гг. «супольнасць узрушаных» крышталізуецца. Яна сутыкаецца з рэчаіснымі і сітуатыўнымі выклікамі, якія праявілі раней існуючыя або сфармавалі новыя «лініі адрознення» — патэнцыйна канфліктагенныя траекторыі дэмаркацыі ўнутры (пакуль?) адзінай супольнасці.

1 Коршунов Г. Системный кризис взаимоотношений власти и общества https://cyberleninka.ru/article/n/sistemnyy-krizis-vzaimootnosheniy-vlasti-i-obschestva/pdf; Коршунов Г. Горизонтальные связи: что осталось от тех структур самоорганизации, которые возникли в 2020 году https://bit.ly/horizontal-con

2 Щитцова Т. К генеалогии «сообщества потрясенных»: common sense - sensus communis - koine aesthesis https://www.iwm.at/sites/default/files/2021-03/RU_Shchyttsova_Common%20sense%5B5527%5D.pdf; Щитцова Т. Суверенная власть и этика ненасилия: структурные основания гражданской мобилизации в Беларуси https://cyberleninka.ru/article/n/suverennaya-vlast-i-etika-nenasiliya-strukturnye-osnovaniya-grazhdanskoy-mobilizatsii-v-belarusi/viewer

3 Папулярны беларускі мем.

Што гэта за лініі (і ці ёсць яны?), паміж кім (групы), на грунце чаго (крытэры) і калі яны ўзнікаюць (трыгеры). Наколькі яны канфліктагенны (кірунак і ступень), як на гэта ўплывае прапаганда (медыя агулам, блогеры ў прыватнасці) — гэтыя пытанні пакуль дрэнна даследаваны.

Некаторыя дадзеныя апытанняў Chatham House і «Народнага апытання» дазваляюць казаць аб адрозненнях у ацэнцы стратэгій дзеянняў палітычных цэнтраў дэмакратычнага руху і аб некаторых іншых значных лініях падзелу (найбольш істотнай з якіх, мабыць, была ацэнка дзеянняў Расіі ў лютым 2022 года). Аднак тэма канфліктаў ці рознагалоссяў унутры беларускай пратэстнай супольнасці да гэтага часу застаецца за рамкамі сур'ёзнага і паслядоўнага аналізу.

Аднак калі арыентавацца на перспектыву, гэтыя лініі разломаў (і ступень іх сур'ёзнасці і крытычнасці) трэба ведаць ужо цяпер, роўна як і прапрацоўваць шляхі іх вырашэння.

Перадпраектны аналіз публікацый у асноўных беларускіх медыях [4] паказвае, што, сапраўды, камунікатыўныя канфлікты высокага ўзроўню сярод беларускай пра-дэмакратычнай аўдыторыі ёсць. У асноўным канфлікты разгортваюцца ў сацыяльных сетках, але часам іх напружанне дасягае такога ўзроўню, на які рэагуюць і «класічныя» медыя.

Важна, што гэтае напружанне не з'яўляецца сталай характарыстыкай аўдыторыі (ва ўсякім разе, тое, што выліваецца ў буйныя камунікатыўныя сутычкі, якія прынята зваць «бульба-срачамі»). Тое, што мы назіраем па рэакцыях медыя, мае відавочна хвалепадобны характар. Наш аналіз [5] паказвае, што самым "пладавітым" на такія ўсплёскі ўзаемнага негатыву быў 2022 год. Больш чым за 3 гады з 30 публікацый (у медыя і тэлеграм-каналах), у якіх закраналіся ці апісваліся такога кшталту спрэчкі, на 2022 год выпадае ⅔ з іх (20 кейсаў). Пры гэтым больш за палову з іх (11) выйшлі на працягу ўсяго двух месяцаў — ліпеня і жніўня 2022 года [6].

Уздымы напругі, якія правакуюць спрэчкі сярод беларусаў (т.зв. «бульбасрачы») часцей за ўсё з'яўляюцца рэакцыяй на нейкія нагоды, як медыйнага/блогерскага, так і падзейнага характараў.

Так, напрыклад, у студзені 2024 года падставай для «бульбасрачаў» стала затрыманне музыкаў гурта «Nizkiz» (сэнс: як можна заставацца да гэтага часу ў Беларусі з пратэстным бэкграўндам). У 2023 годзе тэмамі спрэчак, якія згадваліся ў медыя, былі медаль з дэвізам «Беларусь перад усім», разлад унутры палітычных сіл і стаўленне да моўнага пытання. У 2022 годзе выразна вылучаюцца два блокі тэм, якія выклікалі напружанне: а) умоўна «традыцыйны» (тыя, хто з'ехалі, і тыя, хто засталіся; моўнае пытанне) і б) «палітычнае» (суб'екты і дзеянні дэмакратычных сіл).

---

4 Зеркало, Белсат, Наша ніва, Радыё Свабода, Еўрарадыё, Маланка, Медыязона, Салідарносць, Новы час.

5 Пошук на сайтах выданняў па ключавых словах ("бульбосрач", "бульбасрач") за перыяд 2021-2024 гг. Дадатковы такт пошуку праводзіўся па тэлэграм-каналам. Разам за больш чым 3 гады было знайдена 30 артыкулаў, больш-менш датычных тэмы "бульбасрачаў".

6 Для звестак: 2021 год – 3 публікацыі, 2023 год – 5 публікацый, 2024 год – 2 публікацыі (абедзьве пра кейс "Nizkiz").

Фонам, які практычна заўсёды ёсць у абмеркаванні беларускіх спрэчак, з'яўляецца розніца / адрозненне / узаемныя абвінавачванні паміж «тымі, хто з'ехаў» і «тымі, хто застаўся».

Аналіз публікацый у медыя даводзіць, што часцей за ўсё канфліктнасць у абмеркаваннях тэмы «з'ехаць-заставацца» журналісты і эксперты тлумачаць альбо агульнай траўматычнасцю сітуацыі, патрэбай выплюхнуць агрэсію, перанакіраваць яе з рэальнага аб'екта (рэжым) на даступны («свае», якія абралі іншую стратэгію паводзін), альбо папросту асаблівасцямі камунікацыі беларусаў. Спробы эксплікаваць глыбейшыя (ці адрозныя ад псіхалагічных) падставы сустракаюцца рэдка, наадварот, агульная ўстаноўка і журналістаў, і экспертаў часцей за ўсё складаецца ў пастуляванні сітуацыйнай і псіхалагічнай прыроды канфліктнасці.

Скрынінг сацыяльных сетак паказвае, што незалежна ад нагоды і зместу абмеркавання тэмы, можна вылучыць два фокуса абмеркавання пытання «з'язджаць або заставацца»:

1. Асабісты выбар, яго падставы, усвядомленасць, права чалавека кіраваць сваім лёсам;

2. Адказнасць перад іншымі (ад блізкіх сваякоў да «аўдыторый», «калег» і «агульнай справы»), «грамадская карыснасць» той ці іншай стратэгіі.

Дадаткова можна пазначыць тэму, якая стала ўзнікаць пазней — гэта тэма вяртання, зараз ці ў будучыні. Тэма вяртання зараз, у прынцыпе, трапляе ў падобныя фрэймы (бяспека і адказнасць за выбар). Але ёсць яшчэ тэма вяртання, калі сітуацыя зменіцца — ці вернуцца тыя, хто з'ехаў, ці будзе куды ім вяртацца, і як іх прымуць тыя, хто заставаўся ў Беларусі ўвесь гэты час?

Трэба адзначыць, што тэма эміграцыі з Беларусі, яе абставінаў, наступстваў і індывідуальнага перажывання сітуацыі ўцёкаў/эвакуацыі/пераезду, таксама як і тэма абставін жыцця ў Беларусі, абмяркоўваецца ў вельмі розных кантэкстах. Часцей за ўсё гэта эксплікацыя асабістага досведу, перажыванняў і разважанняў як тых, хто пакінуў Беларусь, так і тых «сваіх», што застаюцца ў Беларусі. Усё гэта суправаджаецца рэакцыяй падтрымкі, спачування, падзелу сітуацыі — падтрымліваецца дыскурс салідарнасці.

Вынікі перадпраектнага аналізу дазваляюць выказаць здагадку, што мае месца пэўнага роду «асіметрычнасць» канфліктагеннай камунікацыі. Хутчэй за ўсё, яна наўпрост звязана з «асіметрычнасцю публічнасці», якая расце з часам, калі людзі, якія жывуць у Беларусі, усё больш вымушаны да самацэнзуры, але не толькі. Выбар на карысць ад'езду з Беларусі цалкам ухваляўся рэферэнтнай групай ужо пачынаючы з 2020 года, і чым далей, тым больш ён «зразумелы» і не патрабуе тлумачэнняў. А вось выбар на карысць «заставацца ў Беларусі, маючы пратэстны бэкграўнд» чым далей, тым больш патрабуе тлумачэнняў. Апошні кейс з «Nizkiz» — яскравы прыклад [7].

---

7 Почему белорусы упрекают музыкантов из Nizkiz, а не тех, кто их задержал https://euroradio.fm/ru/pochemu-belorusy-uprekayut-muzykantov-iz-nizkiz-ne-tekh-kto-ikh-zaderzhal

# МЕТОДЫКА

У рамках пошуку адказаў на пытанні, пастаўленыя вышэй, мы правялі 30 глыбінных напаўструктураваных інтэрв'ю з беларусамі, якія цяпер жывуць як у Беларусі, так і ў іншых краінах (а канкрэтна ў Польшчы і Літве, як двух найбуйнешых краінах-рэцэпіентах «новай» беларускай міграцыі).

Колькасць рэспандэнтаў размеркаваная наступным чынам:

- Беларусь — 15 інтэрв'ю;
- Польшча — 8 інтэрв'ю;
- Літва — 7 інтэрв'ю.

Усе рэспандэнты тым ці іншым чынам былі актыўнымі ўдзельнікамі беларускіх падзей 2020-2021 гадоў.

Дадатковым крытэрам адбору ў выбарачную сукупнасць была прыналежнасць рэспандэнтаў да адной з найбольш пацярпелых ад рэпрэсій прафесійных груп: журналістыкі, адукацыі і навукі, студэнцтва, медыцыны, сферы IT, бізнесу, адвакатуры, сферы культуры, трэцяга сектара і працоўнага руху.

Галоўным фокусам (прадметам) даследавання былі як актуальныя, так і патэнцыйныя лініі напружанасці/канфліктнасці паміж рознымі сегментамі ці групамі прадэмакратычнай часткі беларускага грамадства.

На працягу даследавання вырашаліся наступныя задачы:

- Выявіць асноўныя мэтавыя групы / групы меркаванняў, паміж якімі фармуюцца дэмаркацыйныя лініі, у першую чаргу — канфліктныя ці патэнцыйна канфліктныя;
- Вызначыць прычыны і фактары ўзнікнення канфліктагенных дэмаркацыйных ліній паміж мэтавымі групамі / групамі меркаванняў (у тым ліку вылучыць набор вербальных маркераў для апісання «іншых» — на перспектыву);
- Высветліць асаблівасці сітуацыйнага генезісу ліній канфліктнасці (падставы-трыгеры і медыясуб'екты);
- Змадэляваць варыянты дынамікі адносінаў паміж ключавымі групамі беларускіх прадэмакратычных актывістаў (групамі меркаванняў).

У якасці дадатковай практычнай задачы разглядалася магчымасць распрацоўкі рэкамендацыі па вядзенні камунікацыі паміж групамі, якія выбіраюць розныя стратэгіі.

***

**Заўвага:** у справаздачы выкарыстоўваюцца цытаты з глыбінных інтервью, у тэксце яны пазначаюцца курсівам. У мэтах забяспячэння ананімнасці рэспандэнтаў цытаты падпісваюцца наступным чынам: *краіна, рэспандэнт/рэспандэнтка, узроставая група.*

# АСНОЎНЫЯ ДЭМАРКАЦЫЙНЫЯ ЛІНІІ

У 2020 годзе мы назіралі высокую ступень салідарнасці людзей, якія выйшлі на пратэст. Тады гэта выглядала як адзіны рух, па-за межамі якога заставаліся ўсе адрозненні паміж удзельнікамі.

З тых падзей прайшло шмат часу, але актывісты ў асноўным мяркуюць, што базавыя моманты, якія злучалі пратэстоўцаў, захоўваюцца. Найперш, гэта незадаволенасць цяперашняй сітуацыяй і яе нявызначанасцю, непрыманне гвалту і рэжыма Лукашэнкі, прынцыповая (але неканрэтызаваная) устаноўка на перамены ў Беларусі:

> *– Мы ведаем, ад чаго хочам адысці, але не ведаем, да чаго ісці.*
>
> *(Польшча, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

> *– …непрынятце таго культурнага кода, які дыктуе ўлада.*
>
> *(Літва, рэспандэнт, 31-40 гадоў)*

> *– Аб'яднанне было не «за», а «супраць». І гэтае «супраць» засталося, але вось уяўленні пра тое, што рабіць далей, як выжываць, якой далей быць Беларусі — тут шмат пытанняў.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

Яшчэ адзін фактар, які аб'ядноўвае — гэта надзея, што ўсё, у тым ліку і ахвяры, «было не дарма».

> *– Ну, надзея на канчатковую змену нейкую. Вядома ж, усе ўжо за 4 гады стаміліся і не вераць, што гэта здарыцца заўтра, але ўсё яшчэ вялікая колькасць людзей спадзяюцца, што гэта здарыцца ў нейкай найбліжэйшай будучыні.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнтка, 21-30 гадоў)*

Акрамя гэтага, у якасці тэм, якія дазваляюць захоўваць салідарнасць удзельнікаў пратэстнага руху 2020 года, выступаюць жаданне вызваліць палітвязняў і асэнсаванне сябе беларусамі нягледзячы ні на што, а таксама такія аб'яднаўчыя выклікі, як пагроза рэстаўрацыі імперыі (расійскай) і вайна Расіі з Украінай.

Разам з тым назапашваюцца і змены, якія сапраўды правакуюць з'яўленне пэўных ліній канфліктагеннай дэмаркацыі ці напружання паміж рознымі групамі прадэмакратычнай часткі беларускага грамадства. Такіх ліній напружанасці паміж рознымі групамі прадэмакратычнай часткі грамадства дастаткова, але большасць з іх не з'яўляюцца агульназначнымі.

Так, у прыватнасці, актывісты з Літвы і Польшчы адзначаюць рознае стаўленне людзей да «моўнага пытання», непаразуменні паміж рознымі дыяспаральнымі суполкамі («старая» і «новая» дыяспары [8]), супярэчнасці паміж прадстаўнікамі і прыхільнікамі розных палітычных сіл. У апошнім выпадку маецца на ўвазе найперш раскол паміж

---

8 Гл., напрыклад, «Старая віленская эміграцыя не злілася з новай — беларусы ментальна розныя» https://d1a9nnmcvk9pjz.cloudfront.net/340041

«пазнякоўцамі» і іншымі палітычнымі блокамі, але таксама часам адчувальная і розніца між «старой» і «новай» апазіцыяй.

У некаторай ступені з гэтым пакаленніцкім размежаваннем кантамінуе і каштоўнасны канфлікт — паміж носьбітамі кансерватыўна-нацыянальнай і ліберальна-дэмакратычнымі сістэмамі поглядаў.

> *– Першыя падтрымліваюць больш кансерватыўныя каштоўнасці — нацыя і беларускасць на першым месцы. Яны скептычна ставяцца да каштоўнасцяў гендарнай роўнасці, LGBT і гэтак далей. Другая група больш за агульначалавечыя каштоўнасці. Нацыянальныя не на першым месцы, на першым — дэмакратыя і свабоды.*
>
> *(Польшча, рэспандэнт, 21-30 гадоў)*

Найчасцей, на меркаванне рэспандэнтаў, гэтае каштоўнаснае супрацьстаянне праяўляецца сярод прадстаўнікоў розных палітычных сіл, хаця, вядома, яно шырока прадстаўлена і ва ўсім грамадстве. Адзначым, што рэспандэнты з Польшчы найчасцей адзначаюць стратэгічную значнасць гэтага каштоўнаснага размежавання.

Для рэспандэнтаў з Беларусі ўсе падзелы на ідэалагічных падставах і прыхільнасці да тых ці іншых палітычных сіл выглядаюць значна менш важнымі. Яны існуюць як бы на перыферыі іх увагі, і часцей за ўсё не прызнаюцца маштабнымі і падставовымі. Беларусы ў Беларусі адзначаюць некаторы ўзровень канфліктнасці паміж прыхільнікамі розных палітычных лідараў, але агулам ставяцца да такіх канфліктаў як да камунальных «разборак» ці змагання за рэсурсы.

> *– Ну, ёсць прыхільнікі розных лідараў, але ўнутры краіны зараз не пра гэта.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

> *– У нас проста няма дастатковага ўзроўню палітычнай культуры, каб людзі канфліктавалі па ідэалагічных пытаннях.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

> *– Я гэта чую ўжо як бы праз зламаны тэлефон. Так, яно да гэтага часу існуе, але праз тое, што я знаходжуся тут, на мяне гэта наогул ніяк не ўплывае. Таму я не магу сказаць, што вось я бачу зараз нейкае супрацьстаянне, напрыклад, Ціханоўскай і, не ведаю, якога-небудзь Цапкала, ці яшчэ кагосьці.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнтка, 21-30 гадоў)*

Таксама ў якасці лакальных тэм, якія выклікаюць напружанне паміж рознымі групамі прадэмакратычных беларусаў, рэспандэнты з Беларусі называюць розныя стратэгіі вызвалення палітвязняў, а таксама розніцу ў ацэнцы мінулага, то бок падзей 2020 года (ці апраўдала сябе стратэгія мірнага пратэсту ці трэба было пераходзіць да сілавога сцэнара).

Рэспандэнты з Беларусі не бачаць асаблівага падзелу ў прадэмакратычным асяроддзі па крытэры геапалітычных арыентацый, адзначаючы, што «пасля пачатку вайны ва Украіне расійская карта стала немагчымай для дэмакратычных сіл». Аднак адзначаюць патэнцыйную праблему ў адносінах з людзьмі, якія, не з'яўляючыся прыхільнікамі Крамля і геапалітычнай арыентацыі на Расію, тым не менш усё больш вымушаны

кантактаваць з расійскім бізнесам, арганізацыямі, ездзіць у Расію на працу, вучобу і г.д. З аднаго боку, з павелічэннем расійскага ўплыву ў Беларусі гэты працэс выглядае непазбежным, з другога — па-ранейшаму ўспрымаецца як праблема, якая патрабуе маральна-этычнага выбару.

Напэўна, найбольш адрозніваюцца ўяўленні беларускіх актывістаў у Беларусі і Літве/Польшчы аб наяўнасці канфліктагенна-дэмаркацыйных ліній паміж прыхільнікамі розных стратэгій супраціву рэжыму. Для рэспандэтаў з Літвы і Польшчы розныя адказы на пытанне аб неабходнай і дастатковай актыўнасці ў супрацьдзеянні рэжыму выступаюць адной з галоўных тэм, якія спараджаюць падзел і канфлікты. Гэта пытанне ахоплівае шырокі абсяг варыяцый, бо меры супраціву рэжыму разглядаюцца на ўсіх узроўнях — ад таго, ісці на перамовы з рэжымам ці не, праз пытанне аб патрэбе менавіта ўзброенага супраціву, да праблемы міжнародных санкцый (трэба іх пашыраць ці, наадварот, скасоўваць).

> *– Асноўнае — гэта перамовы з рэжымам. Бабарыканцы, здаецца, іх падтрымліваюць. А АПК, здаецца, супраць. «Каліноўцы» прапануюць сілавы варыянт. А мірны шлях — незразумела, што прапануюць.*
>
> *(Польшча, рэспандэнт, 21-30 гадоў)*

> *– Можна пачуць ад кагосьці з-за мяжы, што яны не будуць шкадаваць ці зразумеюць, калі Украіна ўдарыць па Беларусі ў адказ, пасля таго, як ляцелі ракеты… Гэта дзікасць!*
>
> *(Польшча, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

> *– Мэта ўва ўсіх адна, а шляхі да яе розныя.*
>
> *(Літва, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

Асобнае пытанне для актывістаў з Польшчы і Літвы, што ў гэтым сэнсе можна і трэба рабіць тым, хто цяпер знаходзіцца ў Беларусі.

> *– Людзі ў Беларусі не лічаць, што ім зараз варта ісці на нейкія заўважныя дзеянні, проста каб не сесці. А за мяжой частка кажа, што вось «зацiхлі і змірыліся».*
>
> *(Польшча, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

Рэспандэнты з Беларусі практычна не бачаць ніякага падзелу і канфліктаў паміж прыхільнікамі розных стратэгій змагання з рэжымам — бо не бачаць стратэгій.

> *– Я зараз наогул ужо не бачу і не чую прапаноў аб нейкіх актыўных дзеяннях да гадзіны Х, да нейкага праславутага акна магчымасцяў.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

> *– Ніхто ў сённяшніх абставінах не прапануе чагосьці больш выразнага, чым нейкія сцэнары, бо актыўны супраціў, самазахаванне, яшчэ нешта — гэта сцэнары. А што абмяркоўваць сцэнар, калі ты не ставіш фільм? Не бачу тут пункта напругі. У выпадку ўзнікнення такога кшталту змястоўных планаў або прапаноў, могуць быць супярэчнасці, а пакуль не.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

Стаўленне да гэтага пытання — актыўных форм супраціву рэжыму — у рэспандэнтаў з Беларусі часта пераламляецца праз прызму ўяўленняў аб тым, што павінны рабіць беларусы ўнутры краіны, часам у даволі саркастычнай форме:

> *– Заканамернасць у тым, што самыя актыўныя людзі ў нас якраз не ў краіне. Больш за ўсё заклікаюць да актыўнага супраціву тыя, хто з'ехаў.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

Ужо пры абмеркаванні розных дэмаркацыйных ліній унутры беларускай прадэмакратычнай супольнасці відавочна, што ўяўленні і прыярытэты рэспандэнтаў з Беларусі і рэспандэнтаў з Літвы і Польшчы адрозніваюцца, і даволі часта кантэкстуальна ўзнікае падзел на беларусаў унутры і звонку краіны. Адна з прынцыпова важных ліній падзелу палягае ці будзе пралягаць паміж тымі, хто з'ехаў з Беларусі, і тымі, хто ў ёй застаўся [9].

У пэўным сэнсе гэтыя два моманты — пытанне аб меры актыўнасці супраціву і стан грамадства абапал мяжы — можна разглядаць як два бакі аднаго медаля. Бо звычайна за больш актыўныя мадэлі супрацьстаяння выказваюцца тыя беларусы, якія могуць гэта сабе дазволіць — то бок беларусы замежжа. Тыя ж беларусы, якія застаюцца ў краіне, такога сабе дазволіць не могуць. Знаходзячыся ва ўмовах сталага рэпрэсіўнага ціску, пагрозы пераследу і затрыманняў, яны натуральным чынам прытрымліваюцца стратэгіі самазахавання і заніжэння ўзроўню актыўнасці, каб не «патрапіць на радары» сілавікоў беларускага рэжыма.

Адзначым, што беларусы Польшчы кажуць пра праблему патэнцыйнага расколу паміж тымі, хто з'ехаў, і тымі, хто застаецца ў Беларусі нашмат часцей, чым беларусы Літвы. Імаверна, тут можа адбівацца той факт, што «польскія» беларусы размеркаваны па вялікай тэрыторыі і нават проста геаграфічна знаходзяцца далёка ад Беларусі. А большасць «літоўскіх» беларусаў канцэнтруюцца ў Вільні, то бок за лічаныя дзясяткі кіламетраў ад беларускай мяжы, на якой дасюль працуе больш памежных пераходаў з Беларуссю, чым у Беларусі з Польшчай. Таму з Літвы Беларусь можа падавацца бліжэй і геаграфічна, і лагістычна.

Як бы там ні было, большасць рэспандэнтаў з Польшчы і Літвы адзначаюць важнасць праблемы размежаванасці беларусаў унутры і па-за межамі краіны. Гэта вельмі маштабная і шматскладовая праблема. Таму што на ўзроўні міжасабовых стасункаў, асабліва паміж сваякамі, зараз збольшага захоўваецца ўзаемапаразуменне.

> *– …не згубіла нікога з найбліжэйшага атачэння! З сяброў не адкалоўся ніхто. У сына — таксама.*
>
> *(Польшча, рэспандэнтка, 61+ гадоў)*

Прынамсі, людзі намагаюцца гэта ўзаемапаразуменне захоўваць, выказваць адно аднаму ўсялякую падтрымку.

9 Адзначым, што па даследаванні 2022 года казаць пра напружанне паміж тымі, хто з'ехаў за мяжу, і хто застаўся ў Беларусі, хутчэй не выпадала (гл. Беларусская диаспора: портрет, связи и перспективы - https://newbelarus.vision/belarusskaya-diaspora/)

*– Пра канфлікт паміж тымі, хто з’ехаў і хто застаўся, я толькі ў СМІ чытаю. Я б казала, што хутчэй, наадварот, існуе ўзаемная падтрымка.*

*(Літва, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

Для рэспандэнтаў з Беларусі падзел на «тых, хто з’ехаў» і «тых, хто засталіся» — самая значная з дэмаркацыйных ліній, якія падзяляюць удзельнікаў пратэстнага руху 2020 года. Гэта той раздзел, аб якім яны гавораць у першую чаргу, без дадатковых і навадных пытанняў.

*– Людзі апынуліся ў рознай сітуацыі, нехта сеў, нехта з’ехаў, нехта застаецца і вымушаны адаптавацца да новых умоў. Вельмі шмат розных груп утварылася, у залежнасці ад таго, як менавіта цябе закранула сітуацыя.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– Што падзяляе? Пытанне, што рабіць ва ўмовах умоўнага канцлагера. Падзел наконт канкрэтных дзеянняў. Жыць тут з небяспекай сесці ці зрабіць усё для забеспячэння ўласнай бяспекі, напрыклад, з’ехаць.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– Улада дамагаецца сваёй мэты — мы жывём вельмі па-рознаму, тыя, хто ў краіне, і тыя, хто па-за ёй. Па-рознаму сябе «экспануем». Не думаю, што ёсць сур’ёзныя розначытанні ва ўяўленні пра далёкую светлую будучыню, але вось сённяшні далягляд вельмі розны.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

Гэты падзел (прынамсі, рытарычна) не ўяўляецца рэспандэнтамі як канфліктны — ні ў сучаснасці, ні ў агляднай перспектыве. Канстатуецца, хутчэй, усё большае павелічэнне дыстанцыі паміж тымі, хто пакінуў Беларусь, і тымі, хто працягвае тут жыць. І ўсё большая «паралельнасць» сусветаў «унутры» і «па-за перыметрам». Гэты працэс успрымаецца як натуральны, які мае аб’ектыўныя і суб’ектыўныя прычыны.

Нягледзячы на працяг існавання той каштоўнаснай базы, якая злучала пратэстоўцаў у 2020-21 гг., беларусы замежжа лічаць, што складваецца сітуацыя, якая спрыяе як праяўленню былых размежаванняў, так і стварэнню новых ліній напружання паміж рознымі групамі прадэмакратычнай часткі беларускага грамадства.

На меркаванне беларусаў Польшчы і Літвы, дзвюма асноўнымі лініямі дэмаркацыі з’яўляюцца: а) пытанне аб меры актыўнасці ў супрацьдзеянні рэжыму і б) розніца паміж тымі, хто з’ехаў за мяжу, і хто застаўся ў Беларусі. Для рэспандэнтаў з Беларусі большасць размежаванняў унутры прадэмакратычнай супольнасці існуюць як бы на перыферыі іх увагі, асноўнай істотнай лініяй дэмаркацыі выступае розніца паміж тымі, хто з’ехаў і тымі, хто застаўся.

## ПРЫЧЫНЫ І ФАКТАРЫ ДЭМАРКАЦЫІ

Нягледзячы на намаганні захоўваць камунікацыю і трымаць сувязь «праз межы», час ідзе, і людзі пачынаюць адчуваць, што сувязі, нават сяброўскія, пакрысе слабеюць.

> *– Атрымліваю вялікую падтрымку, шмат падтрымкі, лайкі, «мы вас чакаем». Але на бытавым узроўні разумею, што губляю кантакт, бо жывём у розных рэчаіснасцях. Кантакты знікаюць без сварак, неўзаметку. Проста як быццам усё менш агульных кропак кантакту. Становіцца менш пра што казаць. Калі будзе магчымасць вярнуцца, мы вернемся іншымі. У іншых будзе зусім іншы досвед.*
>
> *(Польшча, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

> *– Мы можам працягваць верыць у нашае ідэйнае адзінства, у тое, што мы папранейшаму жадаем прыкладна аднаго і таго ж. Але вось розніца ў ладзе жыцця каласальная — ты тут ходзіш па адных калідорах, яны там па іншых. І гэта моцна ўплывае.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

Сапраўды, рэспандэнты даволі часта адзначаюць, што базавымі прычынамі для нарошчвання дыстанцыі паміж рознымі групамі беларусаў шмат у чым становяцца час і побыт, то бок непазбежнае і аб'ектыўнае назапашванне рознага досведу развязання розных жыццёвых пытанняў і праблем.

Трэба асобна адзначыць, што рэспандэнты кажуць пра непаразуменні і напружанні не толькі паміж тымі, хто застаецца ў Беларусі, і тымі, хто з'ехаў. Сярод апошніх таксама існуюць даволі адчувальныя размежаванні па розных прычынах асаблівага, дыяспаральнага генезісу. Пра гэта, дарэчы, больш кажуць беларусы ў Польшчы.

> *– Розны побыт, розныя праблемы, нават у Літве і Польшчы – розныя.*
>
> *(Літва, рэспандэнт, 31-40 гадоў)*

Найбольш адчувальнымі фактарамі такога ўнутрыдыяспаральнага размежавання з'яўляюцца як тыя асаблівасці, якія краіны-рэцыпіенты ствараюць для беларусаў, так і спецыфічная сітуацыя менавіта ў дыяспаральным асяроддзі.

> *– У розных кантэкстах адбіваецца розніца ў матэрыяльным становішчы.*
>
> *(Польшча, рэспандэнт, 21-30 гадоў)*

> *– …для кагосьці бяспека — таксама кантраляваць іншых, як гэта робіць улада. Для кагосьці — проста каб не білі.*
>
> *(Польшча, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

> *– Цяпер канфлікты ўнутры нават свайго кацялка наконт асцярог сувязяў з мянтамі і КДБ. Дзень Волі паказаў, што людзі вельмі баяцца. Таму што пачалі трэсці сваякоў і забіраць уласнасць.*
>
> *(Польшча, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

Праз гэты розны досвед паступова губляецца ўзаемапаразуменне, на змену якому прыходзіць пэўнае напружанне. І найперш, паміж тымі, хто з'ехаў з Беларусі, і тымі, хто там застаецца.

*– Расколы — не расколы, а дыскусіі, часам жорсткія!*

*(Літва, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

*– Не тое каб крыўда пякельная, а такі папрок.*

*(Польшча, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

Рэспандэнты з Беларусі адзначаюць, што складанасці ў камунікацыі (ці, дакладней, зніжэнне яе інтэнсіўнасці) узнікаюць у тым ліку таму, што губляецца агульны парадак дня — занадта розныя праблемы і выклікі стаяць цяпер перад людзьмі па розныя бакі мяжы. Гэта датычыцца і палітычных, і проста жыццёвых, побытавых пытанняў.

*– Сітуацыя ў Беларусі па-рознаму бачыцца тымі, хто ў Беларусі, і тымі, хто па-за Беларуссю. Тым, хто па-за Беларуссю, рэальна здаецца, што нейкая дзейнасць ідзе, там офіс Ціханоўскай чымсьці займаецца… Напэўна, гэта ўсё мае нейкі сэнс. Але знутры Беларусі ўся гэтая валтузня, якой займаецца офіс і іншыя падобныя структуры не выглядаюць увогуле колькі-небудзь істотнай, таму што яны рэальна ні на што не ўплываюць унутры краіны…*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– Штодзённыя праблемы, кароткатэрміновыя выклікі розныя. Кароткатэрміновыя стратэгіі выжывання розныя, і, вядома, гэта ўплывае на ўзроўні паводзінаў. Тыя, хто з'ехаў, могуць казаць гучна, і лічаць гэта сваёй місіяй. Тыя, хто не з'ехаў, вымушаны маўчаць; калі яны збіраюцца жыць у краіне і нешта рабіць, то мусяць рабіць гэта ціха. Мы пастаўленыя ў сітуацыю, калі паводзіны адных гэта асуджэнне паводзін іншых.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

Трэба адзначыць, што глыбіня перажывання і ўзровень рэфлексіі прычын размежавання беларусаў унутры і па-за краінай значна вышэйшыя ў тых удзельнікаў пратэстнага руху 2020 года, якія і цяпер працягваюць грамадска-палітычную актыўнасць у Беларусі ў тым ці іншым выглядзе. Асабліва гэта характэрна для сфер, якія ўнутры краіны былі практычна цалкам разбураны — НДА, журналістыка, культурны і мясцовы актывізм.

*– Мы існуем усё больш і больш паралельна. Канфлікты выяўляюцца ў полі пошуку рэсурсаў і не выносяцца ў публічную прастору — у тым ліку таму, што наш бок вымушана маўчыць. Мы ідзём да сітуацыі непрымання адно аднаго, адгароджвання. Вы жывяце сваім жыццём, мы — сваім.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 61+ гадоў)*

*– Людзі, якія застаюцца ў Беларусі і працягваюць нешта рабіць, нібыта не адпавядаюць чаканням, ці ўяўленням тых людзей, якія з'ехалі, бо яны лічаць, што нічога ў Беларусі рабіць нельга.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

Людзі, якія працягваюць актыўнасць у Беларусі, маюць (пакуль яшчэ) устаноўкі на ўзаемадзеянне з дыяспарай. Гэта значыць,не толькі на падтрыманне добрых асабістых стасункаў, але і на сумесную дзейнасць. Аднак чым далей, тым больш гэтая ўстаноўка слабее. Акрамя аб'ектыўных прычын, тут адыгрывае сваю ролю немагчымасць або нежаданне партнёраў звонку Беларусі прыкладаць дастатковую колькасць намаганняў для максімізацыі бяспекі такога ўзаемадзеяння і для кампенсацыі тых функцый, якія актывісты ў Беларусі зараз выконваць не могуць.

> *– Тыя, хто з'ехаў, маглі б неяк больш падумаць пра пратаколы бяспекі, таму што гэта павялічвае нашу «паралельнасць». Не хочацца ўступаць у адносіны, якія для цябе небяспечныя, калі інфармацыю кантралюе партнёр, а ён пра твае рызыкі неяк не надта думае.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

> *– Цяпер няма экрана для таго, каб выносіць рэальныя праблемы, якія ёсць у краіне. Людзі з Беларусі больш не могуць публічна выступаць, а тыя, хто з'ехалі — не могуць ці не жадаюць быць іх голасам.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнтка, 61+ гадоў)*

Яшчэ адна (квазі)аб'ектыўная прычына, якая абцяжарвае і разбурае камунікацыю паміж беларусамі па розныя бакі мяжы — гэта падзел па спажыванню інфармацыйнага кантэнту. Беларусы ў Беларусі вымушана абмяжоўваюць падпіскі і чытанне беларускіх незалежных медыя і каналаў у сацыяльных сетках, бо практычна ўсе яны прызнаныя «экстрэмісцкімі». Такім чынам разбураецца адзінства інфармацыйнай прасторы, і групы становяцца ўсё больш незразумелымі адна адной.

Сукупнае дзеянне гэтых фактараў прыводзіць да фармавання рознасці жыццёвых сусветаў і паслаблення камунікатыўных і дзейнасных сувязей прадэмакратычна настроеных беларусаў унутры краіны і за яе межамі, стварае напружанне паміж імі. Аднак прычыну эмацыйных ўсплёскаў узаемнай крытыкі і лакальных канфліктаў паміж "тымі, хто з'ехаў" і "тымі, хто застаўся", большасць рэспандэнтаў бачаць не ў гэтым.

Адзначаецца, што вельмі часта падстава для непаразуменняў і ўзаемнай крытыкі ляжыць у іншай плоскасці. Гэта псіхалагічны боль, фрустрацыя, якая ёсьць вынікам блакавання першасных патрэб — галоўным чынам патрэб ва ўласнай бяспецы і агульнай прадказальнасці асабістай будучыні.

> *– …сорамна, нібыта ты збег, а яны засталіся, і яны як бы на перадавой, а ты схаваўся ў тыле… Мне падаецца, мы ўвесь час апраўдваемся, чаму мы з'ехалі, перад тымі, хто застаўся.*
>
> *(Літва, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

> *– Праблема людзей унутры краіны — гэта тое, што немагчыма нешта рабіць. Гэта выпальвае людзей знутры. Ад гэтага канфліктнасць і ўзнікае. Бо калі з драконам змагацца немагчыма ці страшна, дык трэба пакусаць кагосьці, хто побач.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

Парадаксальна, але нібыта аднолькавыя ўмовы нявызначанасці, нібыта агульны боль, насамрэч, вядуць да назапашвання рознага досведу выжывання. Бо розныя кантэкстуальныя ўмовы, розныя побытавыя выклікі, розныя інструменты для таго, каб даць рады і выклікам, і болю.

У выніку мы маем і непрапрацаваныя траўмы па абодва бакі мяжы, і бесперапынны працэс рэтраўматызацыі, які трывае і трывае.

*– Мы ўсе тут выжываем. І ўнутры Беларусь выжывае.*

*(Літва, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

*– …траўма з'ехаўшых, боль адсядзеўшых, параноя тых, хто застаўся…*

*(Польшча, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

*– Мы зараз як аголеныя правады. І мы іскрым. І кожны з нас паасобку, і ўнутры нейкай групы. І гэта не пра тое, што плюсы і мінусы прыцягваюцца. Не, мы яшчэ больш адштурхваемся адно ад аднаго.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

То бок, па меркаваннях беларусаў:

*– …з абодвух бакоў — суцэльны боль. Не можаш з ім нічога зрабіць і выліваеш на сваіх праз няўпэўненасць і неразуменне, што рабіць.*

*(Польшча, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– …шкада і тых, хто з'ехаў; шкада і тых, хто застаўся. Я разумею, што і тыя, і тыя — беларусы, яны жывуць у ненармальным стане.*

*(Літва, рэспандэнтка, 51-60 гадоў)*

*– Гэта чыста псіхалагічны аспект расчаравання. Кожны заплаціў сваю цану, гэта цана для кожнага высокая, і гэта расчараванне, крыўда, што ў нас не атрымалася, і нехта павінен быць вінаваты.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

Акрамя болю, які правакуе эмацыйныя выплескі і канфлікты, рэспандэнты вылучаюць яшчэ адно моцнае пачуццё, што ўскладняе стасункі «праз мяжу». Гэта крыўда ці зайздрасць адно да аднаго.

*– …людзі, якія з'ехалі, яны маюць крыўду да тых, хто застаўся.*

*(Літва, рэспандэнт, 31-40 гадоў)*

*– Для сябе я прыдумала тлумачэнне, якое апраўдвае гэтыя бясконцыя пытанні, чаму ты не з'язджаеш — яны проста зайздросцяць, таму што не могуць прыехаць у Беларусь, а я магу тут жыць.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

*– …«з’ехаўшыя» пакінулі ўсё, усё жыццё. Даводзіцца вучыць непатрэбную мову, туліцца ў здымных пакоях, з’язджаць у нікуды і будаваць жыццё з нуля. Вельмі крыўдна… Мы зайздросцім, што ў іх засталося іх жыццё.*

*(Польшча, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

*– «Вам добра, вы з’ехалі. А мне кожны дзень хадзіць па гэтых вуліцах, бачыць гэтую чырвона-зялёную прыгажосць, ад якой кроў з вачэй»… Гэта напружанне тых, хто застаўся. Бо дзесьці зайздросцяць тым, хто змог з’ехаць.*

*(Літва, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– …атмасфера пастаяннай пагрозы і небяспекі. Мы больш вольныя ў гэтым сэнсе. Зноў жа абмежаванні ў перамяшчэннях, праблемы з візамі і амаль жалезная заслона. А мы можам падарожнічаць па свеце.*

*(Польшча, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

*– Гэта ўзаемная зайздрасць. І абодвум бакам гэта не падабаецца… Усе шукаюць, як зрабіць, каб не балела. І ўсім падаецца, што з другога боку мяжы лягчэй.*

*(Польшча, рэспандэнт, 21-31 гадоў)*

Тут варта адзначыць тое, што можна вызначыць як «феномен Інстаграма». Гэта калі людзі з дапамогай сацыяльных сетак ствараюць прыгожыя вобразы свайго жыцця, якія малююць ідэальную карцінку, часам далёкую ад аб’ектыўнага стану чалавека, што ў замежжы, што ў Беларусі.

*– У сетачках жа ніхто не посціць, што, каб выжыць, выкладаецца на трох працах.*

*(Польшча, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

*– Бо ў іх тут дзеці, ці бацькі, і яны вымушаны былі з’ехаць, а мы тут жывём, у кавярню ходзім! Там у кіламетры людзі на Акрэсціна сядзяць, а вы ў кавярні седзіце!*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

Яшчэ важны момант — гэта ўзаемная недаацэнка сітуацый «суразмоўцаў», нястача ведаў пра тыя праблемы, якія вырашаюцца па іншы бок мяжы. Калі гэта памнажаецца на незадаволенасць сітуацыяй, то выходзіць «сітуацыя няспраўджаных чаканняў».

*– Вы не разумееце ўсёй сітуацыі, бо вы не жывяце тут, вы не ведаеце ўсяго ціску.*

*(Літва, рэспандэнт, 31-40 гадоў)*

*– З боку тых, хто застаўся ў Беларусі, ёсць пэўна праблема неразумення, як складана тым, хто з’ехаў, як складана там легалізавацца, забяспечваць сваё жыццё, вывучыць мовы. Ёсць такія спрошчаныя карцінкі, што людзі з’ехалі — і жыццё адразу наладзілася.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– …тыя, хто з'ехаў, яны штосьці павінны такое зрабіць, і не робяць, і назад таксама нейкія чаканні, што там нешта недастаткова супрацiўляецца.*

*(Літва, рэспандэнтка, 51-60 гадоў)*

*– Тыя, хто з'ехаў да вайны і пасля, — яны розныя. Людзі, якія з'ехалі ў 2020 годзе, думаюць, што тут усе да гэтага часу ў бчб-шкарпэтках ходзяць. Выходзіць новае заканадаўства — чаму вы не пішаце лісты, гэта ж законна? Ну, вядома, гэта законна, але, блін, у 2021 яшчэ гэта было бяспечна, а цяпер — не.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

Спалучэнне аб'ектыўных і суб'ектыўных чыннікаў — назапашаная з цягам часу розніца ў побыце, ладзе жыцця, паўсядзённых выкліках, розніца ў інфармацыйным спажыванні з аднаго боку, і працяглая траўматызацыя, боль і фрустрацыя з другога боку — стымулююць шэраг абвінавачванняў з розных бакоў дзяржаўнай беларускай мяжы.

З пункту гледжання апытаных беларусаў, як замежжа, так і тых, хто жыве ў Беларусі, спіс гэтых абвінавачванняў у мадэльным выглядзе, то бок як **рэканструкцыя** рэспандэнтамі іх суб'ектыўнага камунікатыўнага досведу і ўласных меркаванняў, мае наступныя складнікі:

– З боку тых, хто застаецца ў Беларусі:

- Інтэрпрэтацыя ад'езду з краіны як здрадніцтва, бо «нешта зрабіць на карысць Беларусі можна толькі з Беларусі», «калі б столькі народу не з'ехала, мы б даўно перамаглі»;
- Папрокі ў самазасяроджанасці, заклапочанасці толькі аб сваіх дыяспаральных справах і нават пэўны «паразітызм» на беларускай тэматыцы;
- Абвінавачванні ў тым, што людзі з'язджалі для таго, каб нешта рабіць для краіны, а насамрэч займаюцца ўладкаваннем свайго жыцця, нічога не робяць для змены сітуацыі ў краіне, жывуць у бяспецы, забаўляюцца, падарожнічаюць, і т.п.

– З боку тых, хто з'ехаў з Беларусі:

- Абвінавачванні ў «здрадзе» агульным мэтам, вяртанні ў прыватнае жыццё, у захаванні звыклага ладу жыцця (праца, забавы і інш.);
- Папіканне ў страху, у «маўчанні», у знікненні палітычнай актыўнасці, адсутнасці вулічных пратэстаў,  салідарнасці, у цэлым у тым, што «вы там нічога не робіце»;
- Абвінавачванні ў калабарацыянізме з рэжымам, падтрымцы эканомікі (як мінімум праз выплату падаткаў), легітымацыі рэжыму.

Адзначым, што рэспандэнтам з Польшчы і Літвы было даволі складана акрэсліць тыя прэтэнзіі, якія беларусы звонку выстаўляюць беларусам у Беларусі. У тым ліку і таму, што, як лічаць апытаныя, гэта не вельмі распаўсюджаныя меркаванні.

*– Але гэта не магістральныя думкі сярод дыяспары… гэта можа нават маргінальная пазіцыя.*

*(Польшча, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

Аналагічным чынам рэспандэнты з Беларусі вельмі мала казалі аб сваіх прэтэнзіях да тых, хто з'ехаў з краіны, засяроджваючыся хутчэй на прэтэнзіях у свой бок. Гэта значыць, кожны з бакоў больш адчувальны да абвінавачанняў да сябе, надае больш увагі разуменню і апраўданню сваёй пазіцыі, свайго выбару, чым спробам аспрэчыць пазіцыю і выбар іншых.

Таксама, разважаючы пра недарэчнасць узаемных абвінавачванняў «праз мяжу», рэспандэнты часта кажуць пра тое, што разумеюць і спачуваюць абодвум бакам — і тым, хто з'ехаў, і тым, хто застаўся.

*– Чапляе разлом беларускай душы. Аднолькава баліць за два бакі.*

*(Польшча, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– Мне так шкада… Шкада і тых, якія з'ехалі, і тых, якія засталіся. Я разумею, што і тыя, і тыя — беларусы, якія жывуць у ненармальным стане.*

*(Літва, рэспандэнтка, 51-60 гадоў)*

Асноўнымі прычынамі павелічэння дыстанцыі «праз мяжу», як лічаць рэспандэнты, з'яўляюцца аб'ектыўна розны досвед развязання жыццёвых пытанняў і праблем, розныя выклікі і ўмовы пабудовы індывідуальных жыццёвых стратэгій унутры і звонку Беларусі. Фонам для ўсплёскаў ўзаемнай крытыкі выступаюць псіхалагічны боль і фрустрацыя праз блакаванне патрэб ва ўласнай бяспецы і прадказальнасці будучыні.

Склад узаемных абвінавачванняў «праз мяжу», як іх бачаць рэспандэнты, даволі стэрэатыпны:

- Знутры Беларусі чуюцца абвінавачванні ў тым, што «з'ехалі і кінулі краіну», «на карысць Беларусі можна рабіць толькі з Беларусі», а зараз дыяспара засяроджваецца на сваіх праблемах;
- Звонку ёсць абвінавачванні ў адсутнасці пратэстнай актыўнасці, у падтрымцы (хаця б рублём) беларускай эканомікі, легалізацыі рэжыму, калабарацыянізме.

З абодвух бакоў гучаць прэтэнзіі адно да аднаго ў сыходзе ў прыватнае жыццё.

## СІТУАЦЫЙНЫ ГЕНЕЗІС КАНФЛІКТНАСЦІ

Рэспандэнты з Беларусі ацэньваюць агульную дынаміку канфліктнасці як зніжэнне. На іх суб’ектыўны досвед і ўяўленні — відавочныя, адкрытыя спрэчкі і канфлікты былі больш характэрныя для 2020-2021 гадоў, яшчэ адзін усплёск адбыўся ў 2022 годзе, у сувязі з пачаткам актыўнай фазы вайны ва Украіне. Але ўжо пачынаючы з сярэдзіны 2022 года відавочна канфліктныя абмеркаванні тэмы «з’ехалі-засталіся» практычна зніклі з публічнай прасторы, і ўзнікаюць толькі спарадычна ў сувязі з пэўнымі нагодамі. Асноўную прычыну гэтага яны бачаць у тым, што за гэтыя гады склалася зразумелая сістэма арыентацый і прынцыпе сітуацыі выбара.

> *– Публічнае напружанне наконт пытання «з’язджаць-заставацца» спадае, усе пазіцыі ўжо сфармаваны. Гэта існуе не ў рэжыме супярэчнасцяў, гэта існуе ў рэжыме рознасці рэальнасцяў.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

> *– Пытанні пра тое, чаму ты не з’язджаеш, раней часта задавалі, цяпер амаль няма. Раней людзі спрабавалі прыняць сваё рашэнне, умацавацца ў ім, таму ім важна было. Людзі на эміграцыі часта шукаюць пацвярджэнне свайго выбару, таму ім трэба неяк яго знаходзіць — вось праз пытанні, часам праз агрэсію.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

Пры гэтым некаторыя рэспандэнты адзначаюць, што адным з фактараў зніжэння колькасці публічных спрэчак і разбораў можа быць тое, што беларусы, якія працягваюць жыць у Беларусі, не могуць выказваць публічна свой пункт гледжання. Дыскусіі ці правакацыйныя пасты ў сацыяльных сетках, якія прымушаюць чалавека ўступаць у такую камунікацыю (калі чалавек у настроі «не магу маўчаць»), ствараюць для яго дадатковыя рызыкі.

> *– У Беларусі затрымліваюць і саджаюць за каментары і выказванні, таму ўсё, што адбываецца на палітычную тэму ў інтэрнэце, можа стаць падставай для таго, каб чалавек «прысеў». Таму калі яму так трэба выказацца, і ён не можа гэтага зрабіць ніяк інакш, акрамя як на прасторах інтэрнэту, якія бачныя ўсім, то я бачу ў гэтым вялікую небяспеку.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнтка, 21-30 гадоў)*

Аднак такое змушанае маўчанне прыводзіць не да зняцця праблемы і знаходжання ўзаемаразумення, а да назапашвання ўнутранай напругі, фрустрацыі, нарастання адчужэння.

Фрустрацыя і боль, крыўда і зайздрасць правакуюць існаванне зараз больш-менш роўнага фона непаразумення і напругі, якія час ад часу могуць выліваццa вонкі — перш за ўсё ў сацсетках, у допісах і каментарах.

Беларусы замежжа па-рознаму ацэньваюць агульную дынаміку гэтага фона. Так, адным падаецца, што найбольш канфліктагенны перыяд мы ўжо прайшлі; другія кажуць — наадварот, напружанне «праз мяжу» з часам будзе толькі павялічвацца.

*– …гэта ўсё цяжкасці першага перыяду, і ў прынцыпе яны ўжо сыходзяць паволі на нішто.*

*(Літва, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– …фонавае напружанне пакрысе нарастае.*

*(Польшча, рэспандэнт, 21-30 гадоў)*

Разам з тым, усе апытаныя пагаджаюцца, што лакальныя канфліктныя ўспышкі, спрэчкі і ўзаемныя абвінавачанні ў сацыяльных сетках маюць змешаную прыроду. З аднаго боку яны ўзнікаюць часцей за ўсё праз аб’ектыўныя нагоды, накшталт чарговых затрыманняў альбо нейкіх іншых знакавых падзей:

*– Выбухі праз канкрэтныя нагоды, тыпу Дня Волі ці гадавіны пратэстаў. Калі агаляюцца ўспаміны, калі нагода для рэфлексіі і ўзнікае пытанне: «Хто вінаваты?»*

*(Польшча, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– Успышкі бываюць, калі звонку прапануецца рабіць нейкія дзеянні ўнутры. З пачаткам вайны асабліва было гэта відаць, калі з-за мяжы несліся заклікі выходзіць на вуліцы, роўна так, нібыта гэта 20-ы год. Была маса затрыманняў унутры і маса прэтэнзій звонку, што ж вас так мала выйшла. Невыносна.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

*– Усе гэтыя срачы вакол кейсаў накшталт Nizkiz — гэта боль.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

З другога боку, вельмі моцны чыннік — чалавечы фактар, а менавіта «праца» канкрэтных асоб — блогераў, апін’янмэйкераў і нават, на меркаванне рэспандэнтаў, прафесійных ці паўпрафесійных троляў.

*– Ёсць канкрэтныя асобы, якія з’яўляюцца каталізатарамі працэсу.*

*(Польшча, рэспандэнт, 21-30 гадоў)*

*– ...блогеры чамусьці на сябе ўзялі ролю выразнікаў народнай думкі, часцяком несучы поўную лухту. Ну і тролі вядома дадаюць*

*(Літва, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– Гэта жахліва, калі публічныя людзі дазваляюць сабе ўпасці ў істэрыку ці пачынаюць публічна ср***а паміж сабой.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

Ці выказваюць такія топікстарцеры сваё «набалелае», ці адпрацоўваюць «ганарары» ад замоўцаў з сілавых структур — беларусы замежжа да канца не ўпэўненыя. Але рэспандэнты з Літвы схільныя хутчэй да апошняга варыянта.

Сярод негатыўных наступстваў канфліктаў і абмену ўзаемнымі прэтэнзіямі ў сацыяльных сетках, на думку рэспандэнтаў з Беларусі, — разбурэнне стасункаў паміж людзьмі, а таксама стварэнне негатыўнага іміджу беларусаў як супольнасці. Акрамя таго, такія канфлікты заўсёды на руку дзяржаўнай прапагандзе.

> *– Прапаганда адназначна выкарыстоўвае ўсе нашы срачы. Яны проста рукі паціраюць ад задавальнення, і ўсё абавязкова цягнуць у свае памыйныя тэлеграм-каналы, і там раздзімаюць, абсмоктваюць.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

> *– Тое, што спецслужбы гэтым карыстаюцца — відавочна. Яны рэжысіруюць саму па сабе сітуацыю і выкарыстоўваюць кожную нагоду для таго, каб так адбывалася, гэта ім выгадна па змаўчанні.*
>
> *(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

Аднак, калі казаць пра рэальны ўплыў прапаганды на дэмаркацыйную лінію паміж беларусамі «там» і «тут», то калі ён і ёсць, то грунтуецца хутчэй на выкарыстанні іншых метадаў:

> *– …тыя, якія не збіраліся нікуды ехаць, яны яшчэ апрацаваныя тэлевізарам беларускім, дзе там нас інакш як «збеглымі» не называюць.*
>
> *(Літва, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

> *– гэта заўважна па бацьках — у каго фонава працуе тэлевізар, пачынаецца сумнеў, што мы маем рацыю... Пачынаецца больш негатыву супраць тых, якія з'ехалі. Асабліва ў тых, хто быццам бы быў каля нас.*
>
> *(Польшча, рэспандэнтка,  31-40 гадоў)*

Агульная дынаміка канфліктнасці ў стасунках беларусаў за межамі і ўнутры краіны ідзе на спад; сёння мы маем хутчэй рост дыстанцыі і адчужэння паміж гэтымі дзвюма групамі, чым відавочны канфлікт.

Напружанне звычайна выліваецца ў сацсетках і мае змешаны генезіс: з аднаго боку, падставамі для таго звычайна становяцца нейкія аб'ектыўныя падзеі; з другога боку, раздзімаюцца канфлікты, хутчэй, штучна, амаль лічанымі асобамі.

## ВАРЫЯНТЫ ДЫНАМІКІ РАЗВІЦЦЯ АДНОСІН У БУДУЧЫНІ

Калі паразважаць наконт таго, што мы можам і мусім рабіць у такой сітуацыі, якая высноўваецца, у сітуацыі  нарошчвання размежаванняў, то канструктыўных варыянтаў атрымліваецца не так шмат. Асноўная прапанова, якая вынікае з адказаў беларусаў замежжа на гэтае пытанне, палягае фактычна ў адным — вучыцца паважліваму стаўленню адно да аднаго, вучыцца камунікацыі і адказнаму дыялогу.

> *– Беларускае грамадства вельмі лаецца паміж сабой — у нас няма досведу камунікацый без прэтэнзій і без падвоху. У кожнай фразе шукаем розныя ўзроўні сэнсаў і маем на ўвазе найгоршае. Першая рэакцыя — абарона. І як следства — наша агрэсія. Падазрэнні, агрэсія і барацьба за ўладу.*
>
> *(Польшча, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

> *– ...варта навучыцца менавіта дыскусіям, а не спрэчкам як знішчэнню адзін аднаго, дэбатам, якія дазваляюць зразумець пазіцыю адзін аднаго, у нечым зблізіцца ці не зблізіцца, а проста зразумець іншага чалавека.*
>
> *(Літва, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

Важна, што дыялог мусіць будавацца не толькі ў анлайн-прасторы.

> *– Актыў з Беларусі трэба вывозіць на нейкія сумесныя, практыкі, семінары, агульныя заняткі і абмен вопытам. Больш камунікацыі. Больш узаемапавагі.*
>
> *(Польшча, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

> *– Трэба трымаць сувязь, трэба даваць пасылы і магчымасці. І для тых, хто з'ехаў і хоча вярнуцца, і хто хоча выязджаць з Беларусі на нейкія падзеі. Трэба стымуляцыя актыўнасці для тых, хто можа. Трэба іскаць магчымасці і рэсурсы.*
>
> *(Польшча, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

Дыялог, пра які кажуць беларусы замежжа, мусіць быць комплексным і кумулятыўным. Трэба не толькі адмысловыя пляцоўкі для агульнага дыялогу, але і назапашванне выпрацаваных сэнсаў.

> *– Дрэнна захоўваюцца напрацоўкі, напісаныя стратэгіі, прагавораныя дыскусіі — сацыяльныя сеткі або твітар для гэтага не пасуюць, сайты зачыняюцца.*
>
> *(Польшча, рэспандэнт, 21-30 гадоў)*

Ну і, вядома, дыялог мусіць быць каштоўным не як такі, ён мусіць прынесці плён як у выглядзе ўзаемапаразумення, так і ў фармаце выпрацоўкі нейкага агульнага бачання супольнай будучыні.

> *– ...адзінства мусіць быць. Дзеля агульнай мэты камунікаваць і выпрацоўваць агульны падыход.*
>
> *(Польшча, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

*– Грамадства аб'ядначе той, хто прапануе людзям хоць нейкую вызначанасць.*

*(Літва, рэспандэнт, 31-40 гадоў)*

Разам з тым рэспандэнты, на жаль, не маюць вялікага аптымізму наконт актуальных магчымасцей нівелявання той розніцы, якая зараз з'яўляецца па розныя бакі мяжы.

*– Згладзіць рэальнасць зараз магчымасцяў няма ні ў аднаго боку.*

*(Польшча, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

*– Тут нічога не зробіш, пакуль не зменіцца асяроддзе існавання.*

*(Літва, рэспандэнтка, 51-60 гадоў)*

*– Зараз прымірэнчыя захады рабіць зарана. Хіба толькі на асабістым узроўні.*

*(Польшча, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

А вось што тычыцца магчымай катастрафічнасці наступстваў актуальнай напружанасці паміж тымі хто, з'ехаў, і хто застаецца ў Беларусі, беларусы замежжа як раз больш аптымістычныя:

*– Мой прагноз на ўзаемаадносіны пасля вяртання — пазітыўныя... У цэлым ад таго, што беларус вярнуўся, радасць будзе перавешваць адчуванні ад яго ад'езду.*

*(Польшча, рэспандэнт, да 30 гадоў)*

*– Напружанне ў любым выпадку будзе прысутнічаць па вяртанні. Наколькі вялікім — залежыць ад часу, колькі гадоў. Калі б сёння-заўтра, то гэта было б мінімальна. З іншага боку тое, што мы памяркоўныя — можа гэта дапаможа абвыкнуць.*

*(Польшча, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

*– Маю веру ў розум і ў тую моладзь, якая здымала абутак і прыбірала за сабой смецце на маршах.*

*(Польшча, рэспандэнтка, 61+ гадоў)*

Рэспандэнты з Беларусі дастаткова асцярожныя ў прагнозах наконт таго, якой будзе сітуацыя вяртання тых беларусаў, якія пакінулі краіну. І справа не ў канфлікце і напружанні паміж імі і тымі, хто застаецца ў краіне (маецца на ўвазе прадэмакратычная частка), тут якраз прагнозы вельмі аптымістычныя.

*– Усе гэтыя супярэчнасці небяспечныя ў моманце, але, калі будзе трэба, калі глабальна сітуацыя неяк стабілізуецца, мы аб'яднаемся.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 31-40 гадоў)*

*– Я думаю, што гэта наша інфармацыйная бурбалка пра тых, хто з'ехалі і тых, хто тут — яна лопне, калі мы збяромся разам. Яе значна больш у віртуале.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

Аднак сама Беларусь становіцца іншай, таму, на думку актывістаў у краіне, людзям, якія захочуць сюды вярнуцца, давядзецца адаптавацца да новай сітуацыі, да ўмоў рэальнай Беларусі, а не той, якая існуе зараз у іх уяўленнях. Безумоўна, адзін з галоўных фактараў тут — час.

*– Адлегласць паміж тымі, хто з'ехаў, і тымі, хто застаўся, вядома, будзе расці, і ўсё залежыць ад таго, колькі часу міне да ўзнаўлення «нармальнасці». І склеіць гэта потым разам будзе тым цяжэй, чым больш часу пройдзе. І гэты шлях можа быць такім доўгім, што склеіць гэта будзе немагчыма, як у сітуацыі заходніх і ўсходніх немцаў.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

Таму рэспандэнты бачаць задачу не толькі ў падтрыманні міжасобовых сувязяў паміж беларусамі па розныя бакі мяжы, але і ў стварэнні адэкватнай карціны таго, што адбываецца ў краіне для тых, хто збіраецца ў яе вярнуцца.

Што да спосабаў зняцця напружанасці і ўтрымання цэласнасці супольнасці беларусаў, якія па-ранейшаму настроены на перамены ў краіне, то тут уяўленні рэспандэнтаў з Беларусі засяроджаны на дзвюх асноўных сферах.

Першая — падтрыманне міжасабовых сувязяў і камунікацыі ў розных формах.

*– Пераадоленне канфліктнасці адбываецца дзякуючы асабістым сустрэчам. Калі людзі маюць жывы кантакт, на рознага роду пляцоўках, ім лягчэй зразумець адно аднаго, знікаюць домыслы, калі чалавек з табой размаўляе.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

*– Патрэбны нейкія формы камунікацыі. Тут, вядома, праблемы бяспекі, і простымі крокамі, накшталт канферэнцыі, дзе ёсць і тыя, і іншыя, гэтага не вырашыць. Але нейкае ўзаемадзеянне патрэбнае, магчыма, у розных формах. Аднак я не бачу, каб нехта быў заклапочаны гэтымі пытаннямі сёння.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

Другая — спецыяльная праца ў інфармацыйнай прасторы, змена дыскурсу медыя, уключэнне лідараў меркаванняў і маральных аўтарытэтаў у зняцце супярэчнасцяў і лакальных канфліктаў паміж беларусамі.

*– Гэта задача для медыя — узмацненне кампанента рэфлексіўных тэкстаў, нармальнай публіцыстыкі, ну і, вядома, падсвечваць беларускую культуру.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– Абмеркаванне ў медыя пазіцый аўтарытэтных людзей, якія могуць стаць вышэй за працэсы, і паглядзець на іх зверху, ці з боку, ці агулам, ці ў кантэксце. Такая маральна-асветніцкая дзейнасць.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– Ну і медыя, вядома. Вось «Жыццё-маліна» робяць такія доўгія гісторыі з тымі, хто з'ехаў, калі людзі могуць комплексна расказаць усю сітуацыю, усю гісторыю. У людзей, якія засталіся, няма магчымасці раскрыць сваю сітуацыю. Калі можна было б расказаць, чаму ты тут жывеш, што ты робіш, чаму ты думаеш, што гэта важна і трэба, то, напэўна, было б больш раўнавагі ў гэтых пазіцыях. Так, тут ёсць пытанні бяспекі, але можна ж нешта прыдумаць, калі захацець.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

*– Медыя стварылі гэтую сітуацыю, калі кожны з'ехаўшы стаў успрымацца як прамы спадкаемец Кастуся Каліноўскага, вось няхай яны ае і развязваюць.*

*(Беларусь, рэспандэнт, 41-50 гадоў)*

*– Многія эфіры беларускіх СМІ такія ўжо нібы апрычоныя ад Беларусі, некаторыя праз слова польскія слоўцы ўжываюць, каб паказаць, як яны добра асіміляваліся. Трэба рабіць нешта, каб беларусы ў Беларусі адчувалі дачыненне да таго, што адбываецца за мяжой. Прыбраць грэблівы тон, калі гавораць пра беларусаў у Беларусі — вельмі часта гэта стала гучаць, можна меркаваць, што гэта пра ябацек, але распаўсюджваецца нібыта на ўсіх. А я тут, і я адчуваю, што гэта і пра мяне.*

*(Беларусь, рэспандэнтка, 41-50 гадоў)*

Супрацьдзеяннем канфліктнасці рэспандэнты бачаць практыкаванні ў адказным дыялогу, у наладжванні сувязяў (інфармацыйных, камунікатыўных, асабістых) «праз межы» і выпрацоўцы агульных стратэгій на будучыню. А таксама спецыяльную медыйную работу, накіраваную на зняцце супярэчнасцей і падсвечванне жыцця ў Беларусі.

Разам з тым, узровень аптымізму аб эфектыўнасці такіх інструментаў адносна невялікі. Затое ёсць хутчэй пазітыўнае бачанне перспектыў узаемапаразумення паміж беларусамі ў выпадку вяртання «з'ехаўшых» на радзіму.

# АГУЛЬНЫЯ ВЫСНОВЫ

Тая частка пратэстнага руху 2020-2021 года, якая захоўвае ўстаноўку на дасягненне перамен у Беларусі, аб’яднана сёння, па-першае, першапачатковай каштоўнаснай базай супрацьстаяння дыктатуры і непрымання гвалту, па-другое, новымі выклікамі: неабходнасцю вызвалення палітвязняў, пагрозай паглынання Беларусі, вайной Расіі і Украіны.

У той жа час, зацяжны перыяд панавання дыктатуры ў краіне, адсутнасць выразных перспектыў і стратэгій, пагаршэнне сітуацыі як унутры краіны, так і ў больш шырокім рэгіянальным кантэксце, прыводзяць да размывання адчування адзінства, расчаравання і выгарання людзей, актуалізацыі назапашаных супярэчнасцей і з’яўлення новых дэмаркацыйных ліній унутры калісьці салідарнай (хай і сітуатыўна) супольнасці. Канфлікты ўзнікаюць на глебе рэфлексіі чыннікаў паразы пратэстнага руху ў 2020 годзе, на ідэалагічных падставах і прыхільнасці тым ці іншым палітычным сілам або лідарам, па моўным пытанні, па адстойванні правільнасці тых ці іншых метадаў барацьбы з рэжымам, вызвалення палітвязняў і т.п.

Адной з базавых і ўстойлівых ліній дэмаркацыі становіцца падзел беларусаў на тых, хто пакінуў краіну, і тых, хто працягвае ў ёй жыць.

Гэты падзел і першапачаткова быў не толькі геаграфічным, аднак калі спачатку ён успрымаўся як часовы, які хутка міне, то чым больш нявызначанымі становяцца часовыя перспектывы наступлення палітычных змен у краіне, тым больш устойлівай становіцца лінія дэмаркацыі паміж беларусамі па розныя бакі геаграфічнай мяжы.

Пры гэтым, калі ў 2020-2021 годзе абмеркаванне пытанняў, ці варта з’язджаць з Беларусі / ці трэба заставацца ў краіне, насіла прынцыповы, распаўсюджаны і часта канфліктны характар, то прыкладна пачынаючы з сярэдзіны 2022 года гэтае пытанне перастае быць канфліктагенным фактарам (за выключэннем спарадычных выбухаў у сацыяльных сетках). З абодвух бакоў адбываецца прыняцце сітуацыі і наяўнасці ў ёй розных індывідуальных выбараў. Аднак дыстанцыя паміж гэтымі дзвюма групамі ўсё больш павялічваецца. І менавіта гэта адзін з выклікаў беларускаму дэмакратычнаму руху сёння, на які трэба шукаць адказ.

Асноўнымі фактарамі павелічэння дыстанцыі паміж беларусамі ўнутры і па-за краінай з’яўляюцца:

- Розніца ў ладзе жыцця і характарыстыках штодзённасці, якая павялічваецца; індывідуальных выкліках і праблемах, з якімі сутыкаюцца беларусы па розныя бакі беларускай мяжы;
- Комплекс псіхалагічных фактараў: траўматычны досвед — як індывідуальны, так і калектыўны, боль, віна, страх за сябе і за іншых;
- Паслабленне (аж да знікнення) дзейнасных сувязей і разбурэнне агульнасці палітычнай павесткі;
- Адсутнасць агульнага «экрана», інфармацыйнай прасторы, у выніку чаго кожная з груп мае свой вобраз «Беларусі» і свой вобраз «замежжа»;
- Адсутнасць выразнай перспектывы на будучыню, сярэднетэрміновых арыенціраў.

Захаванне сувязяў паміж беларусамі ўнутры і па-за Беларуссю гэта комплексная і складаная задача, якая ўлічвае як складанасці ўмоваў жыцця і дзейнасці беларускай дыяспары, так і характар і ўзровень рэпрэсій унутры краіны. Абапіраючыся на дадзеныя даследаванні, мы можам акрэсліць некалькі магчымых напрамкаў дзеянняў у надзеі, што яны пакладуць пачатак дыскусіі і далейшаму пошуку практычных хадоў у развязанні гэтай праблемы:

- Унікане (як у міжасабовай, так і ў публічнай камунікацыі) генералізацыі ў ацэнках, адмова як ад стыгматызацыі, так і ад гераізацыі выбару на карысць любога рашэння (з'язджаць ці не з'язджаць) у агульным выглядзе; прэзумпцыя разумнасці людзей і іх права прымаць рашэнні адносна свайго жыцця. Прасоўванне норм дыялогу, узаемнай павагі і адказнасці ў камунікацыі.
- Улік калектыўнай траўмаванасці беларусаў, якая, хаця і мае агульны першапачатковы генезіс (рэальнае ці патэнцыйнае сутыкненне з рэпрэсіўнай машынай беларускага рэжыма), істотна адрозніваецца па кірунках і асаблівасцях наступнай рэтраўматызацыі («траўма ўцекача», «траўма пакінутых»).
- Падтрыманне міжасабовых кантактаў і стварэнне прастор для камунікацыі як анлайн, так і афлайн. Пошук адэкватных форм, якія могуць дазваляць такую камунікацыю з захаваннем неабходных пратаколаў бяспекі.
- Пераадоленне «асіметрыі публічнасці». Праблема немагчымасці публічнага выказвання свайго меркавання, пазіцыі, экспанавання працэсаў, што адбываюцца ў краіне, — гэта не толькі (і нават не столькі) праблема беларусаў унутры краіны. Адсутнасць такой публічнасці фармуе прынцыпова няправільнае ўяўленне аб сітуацыі ў краіне для ўсіх зацікаўленых у пераменах. Праз адмысловую непублічную працу з беларусамі ўнутры краіны беларусы замежжа могуць быць іх «голасам», фармуляваць павестку з улікам іх поглядаў і ведаў пра тое, што адбываецца ў краіне. Праз гэта беларусы і ўнутры, і звонку Беларусі маглі б мець больш адэкватнае ўяўленне пра сучасны стан у краіне, лепей арыентавацца ў магчымасцях, выпрацоўваць больш адэкватныя стратэгіі дзейнасці.
- Адмысловая інфармацыйная і медыйная праца, накіраваная на стварэнне агульнай прасторы сэнсаў, аналітыку сітуацыі, выпрацоўванне ці падтрымку агульных падставаў для захавання адзінства і ідэнтычнасці, уцягванне лідараў меркаванняў і маральных аўтарытэтаў у дыскусіі па вострых ці балючых пытаннях.
- Безумоўны ўлік пытанняў бяспекі для беларусаў у дзейнасці розных суб'ектаў — ад арганізатараў розных імпрэз у асобе НДА да журналістаў і рэдакцый медыя.

# АЎТАРЫ

**Генадзь Коршунаў** – сацыёлаг, кандыдат сацыялагічных навук. Больш за 20 год займаецца вывучэннем асаблівасцяў і дынамікі беларускага грамадства.

**Вера Вечар** — сацыёлаг, кандыдат сацыялагічных навук. Больш за 10 год працуе ў сферы даследванняў грамадскай думкі і развіцця грамадзянскай супольнасці ў Беларусі.

**Наталля Бружнік** — майстар сацыяльных навук у галіне публічнай палітыкі. Больш за 6 гадоў працы з тэмай захавання культуры памяці.

*(На жаль, з мэтаў бяспекі пазначаны не ўсе аўтары даследавання).*

Публічная ўстанова «Формула чалавечнасці» была зарэгістравана ў Вільні 6 красавіка 2023 г. з мэтай спрыяць прымірэнню і аб’яднанню супольнасцяў пасля канфліктаў праз узаемадзеянне з носьбітамі розных культур памяці.

Дзейнасць арганізацыі складаецца з дыскуссійных, інфармацыйных, культурных і іншых мерапрыемстваў, накіраваных на асвету шырокага кола грамадзян у галіне публічнай гісторыі, палітыкі і правоў чалавека, прасоўванне сярод мэтавых груп дэмакратычных каштоўнасцяў, адказнасці за тое, што адбываецца ў сваей краіне і ў рэгіене, кансалідацыю дэмакратычна настроеных людзей і людзей, якія лічаць сябе «па-за палітыкай», выкрыццё прапаганды дыктатарскіх рэжымаў і набыцце навыкаў супрацстаяць ей, а таксама на прымірэнне паміж рознымі групамі грамадзянскай супольнасці.

Вокладка: Наша Ніва/Wikipedia